# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

14 ВЕРАСНЯ 1995 года чацвер

№12 (1729)


*чалавек першай паласы*

## "Калі мы не будзем беражліва ставіцца да таго, што мы маем, то будзем жыць у яшчэ горшых умовах."



***Знаёмцеся, кандыдат хімічных навук Паўлаў Анатоль Васільевіч — прарэктар па вучэбнай рабоце і сацыяльных пытаннях.***

***Нарадзіўся ў 1949 годзе пад сузор'ем Блізнятаў у Выбаргу. Скончыў СШ № 4 г. Мінска. У юнацтве захапляўся спортам — быў шматкратным чэмпіёнам БДУ па лыжных гонках, членам студэнцкай зборнай універсітэта.***

***Скончыў БДУ.***

***Апошнія пяць гадоў працаваў старшынёй прафкама універсітэта. Палітычная прыналежнасць — беспартыйны, у мінулым член КПСС. Любімае захапленне — кнігі. Аддае перавагу гістарычнай літаратуры, мастацкай літаратуры, класіцы. Цяпер чытае Буніна. Любімыя пісьменнікі — Талстой, Дастаеўскі, Лермантаў. Любімыя стравы — дранікі са смятанай, мачанка.***

Навучальны год толькі пачаўся, і, як звычайна, у першыя яго тыдні справай нумар адзін ва універсітэце з'яўляецца засяленне ў інтэрнат.

**— Анатоль Васільевіч, раскажыце, калі ласка, якія ж вынікі засялення.**

— Перш за ўсё трэба сказаць, што ўсе студэнты, якія маюць права на пражыванне ў інтэрнаце, заселены. Сёлета мы правялі вялікую папярэднюю работу. Прычым адказнасць за засяленне неслі не толькі каменданты інтэрнатаў, але і аддзел па справах моладзі, і студэнцкі прафкам, а таксама дэканаты. Каб упарадкаваць засяленне, усім студэнтам былі выпісаны ордэры. Таму ўсё прайшло адносна хутка. Аднак на будучыню мы плануем палепшыць працэс засялення ў інтэрнаты. Каб не было стоўпатварэнняў і каб студэнты не трацілі прытомнасць, выстойваючы вялізныя чэргі, мы плануем праводзіць засяленне не за адзін-два дні, а, напрыклад, з 26 жніўня і больш паслядоўна. Засяліць спачатку пятыя курсы і далей па ўбыванню ці наадварот — спачатку першыя і г.д. да пятых.

Варта адзначыць, што большасць нашых інтэрнатаў знаходзіцца ў вартым жалю стане. Інтэрнат № 7 па санітарных нормах на сённяшні дзень увогуле павінен быць зачынены на капітальны рамонт. Але сітуацыя зараз такая, што дзяржава на ўтрыманне інтэрнатаў грошай нам практычна не дае. І таму рамонт мы павінны рабіць толькі сваімі сіламі. Сёлета быў зроблены капітальны рамонт інтэрната № 5, і ўсе сродкі, якія мы маглі знайсці, і даходы ад арэнды памяшканняў, якія мы здаем тым ці іншым арганізацыям, і плата за навучанне тых студэнтаў, якія займаюцца на платнай форме навучання, — практычна усё было пушчана туды. Шчыра кажучы, парадаксальная склалася сітуацыя. Фактычна мы не з'яўляемся ўладальнікамі будынкаў інтэрнатаў, а толькі арандуем іх у дзяржавы. І тыя грашовыя сродкі, якія мы маглі б пусціць на іншыя патрэбы: дабавіць некаму стыпендыю, аказаць дапамогу малазабяспечаным студэнтам, павысіць аклады прыбіральшчыцам, штосьці палепшыць у інтэрнатах, павысіць заробак тым самым камендантам,— мы вымушаныя былі выдаткаваць на рамонт інтэрната. Таму ў цяперашні час грошай катастрафічна не хапае, і капітальны рамонт сёмага інтэрната — пад вялікім пытаннем. Дый закрыць самы буйны ў рэспубліцы студэнцкі інтэрнат на гэты момант пакуль не ўяўляецца магчымым.

**— Верагодна, у сувязі з недахопам грашовых сродкаў павялічыцца і плата за інтэрнат?**

— Не, плата застанецца той жа — 6 тысяч у месяц. А вось за дадатковы расход электраэнергіі студэнтам давядзецца даплочваць асобна. Паводле раней прынятага палажэння студэнт не мае права карыстацца ў пакоі халадзільнікам, тэлевізарам, абагравальнікам і г.д. Аднак амаль ва ўсіх пакоях ёсць тыя ці іншыя электрапрыборы бытавога выкарыстання. І універсітэту за электраэнергію штомесяц даводзіцца плаціць сотні мільёнаў рублёў. Таму сёлета мы падпісалі загад па універсітэту, і хутка ён уступіць у сілу, аб тым, каб з кожнага пакоя, у якім ёсць электрапрыборы, браць штомесяц кошт аднаго энергаталона. Стараста паверха будзе збіраць грошы, а ў канцы месяца здаваць іх у бухгалтэрыю. Так што плаціць давядзецца дадаткова толькі за карыстанне бытавымі электрапрыборамі, а плата за інтэрнат застанецца такой жа мінімальнай, можа быць нават занадта.

Таму што складаецца ўражанне, што многія студэнты таму і не цэняць свой пакой ў інтэрнаце, што танна: выбіваюць дзверы ў падсобных памяшканнях, разбіваюць шыбы. А гэтым летам здараліся нават такія выпадкі, калі студэнты выбівалі дзверы і адкрывалі чужыя пакоі. Таму я хацеў бы звярнуцца да нашых студэнтаў, каб яны ставіліся да інтэрнатаў гэтаксама беражна, як да свайго дома. А мы будзем рэгулярна кантраляваць захоўванне парадку. Мы будзем спрабаваць адраджаць самакіраванне і ўзмацняць кантроль з боку дэканатаў. Можа, нават паспрабуем зноў увесці ў той ці іншай форме куратарскі інстытут. Апроч таго, мы хочам прыцягнуць аспірантаў, якім патрэбны інтэрнат, для работы на пасадзе выхавальніка ў інтэрнаце. Бо асноўнае жыццё пачынаецца, як правіла, пасля 24, і таму вельмі важна, каб выхавальнік і ў гэты час мог прадухіліць розныя "п'яныя" эксцэсы, якія почасту суправаджаюцца выламанымі дзвярыма, паламанай мэбляю і г.д., рамонт якіх у сённяшніх умовах амаль немагчымы.

Таму мы будзем вельмі строга сачыць за захоўваннем парадку. Я асабіста буду наведваць інтэрнаты. Мяркуецца нават высяляць з інтэрната за парушэнне парадку і паводзін. Тым студэнтам, на якіх каменданты падалі ўжо зараз звесткі аб парушэнні паводзінаў у інтэрнаце, мы адмовілі ў пакоях.

**— Але гэта адміністратыўныя меры...**

— Так, мы вымушаныя звяртацца да іх. Бо калі мы не будзем беражліва ставіцца да таго, што мы маем, то будзем жыць у яшчэ горшых умовах.

Вялікая адказнасць будзе ўскладацца на выхавальнікаў. Мы будзем патрабаваць, каб яны прадстаўлялі нам план работы і будзем сачыць за яго выкананнем. Бо выхавальнік павінен і па пакоях прайсціся, і арганізаваць разам са студэнцкім клубам нейкае мерапрыемства. Ён павінен і вечар арганізаваць, і сустрэчу з цікавым чалавекам правесці, напрыклад, вядомым выкладчыкам універсітэта.

Усё гэта мы будзем спрабаваць узнавіць, што атрымаецца — прагназаваць не магу. На сённяшні дзень сітуацыя ў грамадстве настолькі складаная, што дамагчыся нечага ідэальнага ў адным маленькім кавалачку нельга. Але тое, што залежыць ад нас, мы будзем рабіць.

**— У сувязі з падпісаннем указа аб нявыплаце стыпендый студэнтам, якія маюць у сесію "здавальняюча", верагодна, многім студэнтам давядзецца не соладка. Што б Вы ім параілі?**

— Так, са стыпендыямі туга. Грошай і так пры ўсім жаданні не хапае на месяц, а калі ты іх яшчэ і не атрымліваеш... Таму мы гатовыя ўсе вакансіі, якія ў нас ёсць па студгарадку, прадаставіць студэнтам. Напрыклад, месца прыбіральшчыцы. Студэнты чамусьці саромяцца гэтай работы. А чаго тут саромецца! Прыбіраеш інтэрнат не для кагосьці, а для сябе ж. А лішнюю гадзіну не паспіш — дык па маладосці гэта і не адчуваецца зусім. Так што калі студэнт хоча працаваць — мы з задавальненнем яго возьмем.

**— І куды ён можа звярнуцца?**

— Ці непасрэдна да мяне (у мяне дзверы заўсёды адкрытыя), ці ў аддзел па справах моладзі да Аляксея Багдановіча, ці ў прафкам. Дарэчы, з нагоды жадання студэнтаў зарабіць. У чэрвені студэнцкі прафкам даў інфармацыю аб тым, што можна паехаць у Польшчу ў будатрад. Бясплатныя харчаванне і пражыванне, ды яшчэ і заробак — 5 долараў у дзень. Канешне, ня дужа вялікі — за месяц 150 долараў,— але ўсё ж нешта купіць можна. І мы з усяго універсітэта ( амаль 10 тысяч чалавек) не маглі сабраць групу з 30 чалавек. Гэта проста дзівіць.

Мне падабаецца нашая моладзь. Яна больш раскаваная: студэнты запраста ідуць да прарэктара, рэктара. У свой час і да дэкана хадзілі толькі тады, калі выклічуць. І гэта канешне цудоўна. Але разам з тым дух спажывання ў студэнтаў па-ранейшаму захоўваецца. Як яго пазбавіцца, я не ведаю.

Аддзел па справах моладзі плануе і ў далейшым арганізоўваць летнія паездкі (магчыма, нават за мяжу), каб студэнты маглі зарабіць. Магчымасць зарабіць дасць і студэнцкае кафе, якое будзе адкрытае толькі ў тым выпадку. калі ў гэтым будзе непасрэдная зацікаўленасць студэнтаў. А кафе — гэта не толькі ж заробак, але і час, які можна весела правесці.

**— Скажыце, Анатоль Васільевіч, якія яшчэ мерапрыемствы па арганізацыі адпачынку студэнтаў Вы плануеце правесці?**

— Ужо даўно стаў традыцыйным веснавым мерапрыемствам фестываль у Вязынцы. Мы плануем больш шырока выкарыстоўваць кафе "Гаўдэамус", якое знаходзіцца ў цэнтры студэнцкага гарадка. Хочацца, каб кожны вечар там была якая-небудзь праграма, каб мы маглі запрасіць туды розныя ансамблі. Бо ў нас ва універсітэце 6 сваіх выдатных калектываў. якіх прымае ўся Еўропа. Чаму яны не могуць выступаць і ў інтэрнатах? Акрамя гэтага, канешне, будзем працягваць традыцыі універсітэцкага КВЗ, а таксама факультэцкіх клубаў. З першага курса будзем шукаць таленавітых хлопцаў і дзяўчат.

І ў заканчэнне я хацеў бы звярнуцца да студэнтаў. Калі ў вас ёсць якія-небудзь прапановы, пажаданні, праблемы — дзверы ў мяне заўсёды адчынены. Я гатоў прыняць любога студэнта па любому пытанню. І мы будзем імкнуцца дапамагчы кожнаму студэнту. За сваё месца я не трымаюся — такі мой прынцып. Але буду працаваць у меру сваіх сіл і здольнасцяў.

**— Дзякуй за інтэрв'ю. Жадаем Вам поспехаў.**

***Вольга Хадарэнка***

## РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

**аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:**

**ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** фізікі цвёрдага цела, генетыкі і біятэхналогіі, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі;

**ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ:** тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, канстытуцыйнага права, эканамічнай геаграфіі замежных краін, агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі;

**ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ:** лазернай фізікі і спектраскапіі, вышэйшай матэматыкі і матэматычнай фізікі, біяфізікі, фізікі цвёрдага цела, фізічнай оптыкі, філасофіі і метадалогіі навукі, сацыялогіі, экалагічнага і аграрнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, рускай літаратуры, тэарэтычнага і славянскага мовазнаўства, гісторыі беларускай мовы, генетыкі і біятэхналогіі, батанікі, біяхіміі, гісторыі новага і найноўшага часу, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, гісторыі старажытнага часу і сярэдніх вякоў;

**СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** інфарматыкі, квантавай радыёфізікі і оптаэлектронікі, гісторыі Беларусі старажытнага часу і сярэдніх вякоў, нямецкай мовы, канстытуцыйнага права;

**ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ:** рыторыкі і методыкі выкладання славянскіх моў і літаратур;

**АСІСТЭНТА КАФЕДРЫ** інфарматыкі.

*Тэрмін конкурса — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

Адрас: 220050, г.Мінск, праспект Ф.Скарыны, 4, Белдзяржуніверсітэт, аддзел кадраў, пакой 233, тэл. 26-59-39.

Аб'ява надрукавана ў газеце "Беларускі універсітэт" 14 верасня 1995 года.

# АБ'ЯВЫ

◆Ансамбль танца"Крыжачок" з 28 жніўня па 10 верасня прымаў удзел у Міжнародным фестывалі ў горадзе Плоўдзіве ў Балгарыі.

А вы, паважаныя першакурснікі, у хуткім часе зможаце далучыцца да гэтых творчых калектываў, бо дырэкцыя па справах культуры Белдзяржуніверсітэта аб'яўляе набор у творчыя аматарскія калектывы: народны ансамбль танца "Крыжачок", аркестр народных інструментаў, акадэмічную народную хараву ю капэлу, народны фальклорны ансамбль "Неруш", музычны тэатр эстрадных мініяцюр, народны хор выкладчыкаў і супрацоўнікаў. За інфармацыяй звяртацца ў 401 пакой галоўнага корпуса або па тэлефону 20-42-07.

◆Студэнтаў, якія цікавяцца гісторыяй і культурай нашай суседняй краіны Польшчы, запрашае культурна-асветніцкае таварыства "Палонія". У першую чаргу — гэта магчымасць вывучэння польскай мовы: нядзельная школа для жадаючых паступіць у польскія вышэйшыя навучальныя ўстановы: хор польскай песні:у хуткім часе адчыніцца бібліятэка польскай кнігі. Кантактны тэлефон: 24-00-06.

◆Савет маладых вучоных Белдзяржуніверсітэта плануе правядзенне навукова-тэхнічнай канферэнцыі маладых вучоных, спецыялістаў і аспірантаў ( узрост да 35 гадоў), прысвечанай 75-годдзю Белдзяржуніверсітэта. Да пачатку канферэнцыі будуць выданы тэзісы дакладаў. Тэзісы прымаюцца да 15.10.95 г. Пасяджэнні тэматычных секцый будуць арганізаваны па факультэтах. З правіламі афармлення тэзісаў можна азнаёміцца ў аддзеле па справах моладзі па адрасу: Мінск, вул. Бабруйская, 7, к. 417, тэл. 68-70-98

## Па выніках паступлення

4700 абітурыентаў выявіла ў гэтым годзе жаданне стаць студэнтамі буйнейшай у рэспубліцы навучальнай установы — Беларускага дзяржаўнага універсітэта ( 890 з іх — на завочнае аддзяленне).

Каля 2000 першакурснікаў дзённага аддзялення прыступілі 1 верасня да вучобы. Каля 500 будуць здаваць экзамены на завочным.

Самы вялікі конкурс заставаўся на такія прэстыжныя спецыяльнасці, як "Псіхалогія", "Эканамічная тэорыя", "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю". "Міжнародныя эканамічныя адносіны" — больш за 4 чалавекі на месца. Самы малы — на спецыяльнасці "Фізіка", "Радыёфізіка", "Фізічная электроніка" — крыху больш за аднаго.

Вельмі цікавая сітуацыя склалася ў гэтым годзе з наборам на спецыяльнасць "Міжнародныя адносіны". Пры пачатковым конкурсе 2 чалавекі на месца ў выніку замест 25 набралі толькі 22 чалавекі. Застаецца гадаць: прыёмная камісія перастаралася на першым экзамене ці ў нас ужо перавяліся людзі, здольныя займацца міжнароднымі адносінамі.

У завочнікаў больш за 5 чалавек на месца было ў тых, хто паступаў на спецыяльнасць "Правазнаўства", затое на спецыяльнасць " Матэматыка" прынялі ўсіх жадаючых.

## Чым узрадаваць гасцей?

*Сделал гадость — в сердце радость.*
*Руская народная мудрасць*

Гэты матэрыял я не параіў бы чытаць тым, хто не любіць рабіць сюрпрызы сваім знаёмым! Сапраўды, ну якая карысць ад таго, што такі чалавек даведаецца аб таварах, якія можна купіць у кнігарні "Мастацтва" на праспекце Машэрава? Ні яму радасці, ні яго блізкім.

Наадварот — кожнаму, хто любіць глядзець на вырачаныя ў здзіўленні вочы знаёмых, я параіў бы зайсці ў вышэй названую кнігарню: такога набору паскудстваў наўрад ці знойдзеш зараз дзе яшчэ.

Чаго толькі варты муляж яешні! Рэч, трэба сказаць, незаменная ў выпадку, калі да вас падчас вячэры зайшлі госці. Дарэчы, у дадатак да яешні ім можна прапанаваць і выпіць чаго-небудзь з чаркі-непралівайкі...

Але ўявім іншую сітуацыю: госцю захацелася папаліць. Вы адразу ж можаце прапанаваць яму... цыгарэту-пырскаўку. Калі ж ён мае свае — не губляйце надзеі: запальнічка-пырскаўка заўсёды выратуе становішча.

Дарэчы, пырскаюць не толькі цыгарэты і запальніцы. Для аматараў амерыканскага стылю паводзінаў існуе жуйка-пырскаўка.

Але ... Не ўвесь час госці ходзяць да вас. Трэба і самім выбірацца ў госці. У такім выпадку не забудзьцеся прыхапіць з сабой што-небудзь для чаю, што-небудзь такое, што можна ўпокрадкі падкінуць у кубак даверліваму гасціннаму гаспадару: горкі цукар, цукар з пенай ці крывавы цукар. Для ўзмацнення эфекта можна выкарыстаць дэтанатары...

І апошняе ( просьба не чытаць тым, хто не з'яўляецца аматарам здеку з уласнай асобы). Карнавальны прышч і прыстасаванне пад назвай "палец, прабіты цвіком" дапамогуць вам выклікаць шкадобу і спачуванне не толькі з боку вашых сваякоў, але і незнаёмых людзей...

Фантазію, як бачым, гэтыя ўсе прыстасаванні не абмяжоўваюць, палёту думак не замінаюць. Прапанаваныя вышэй варыянты паводзінаў трэба лічыць не за рэкамендацыю і кіраўніцтва да дзеяння, а толькі за адну з магчымасцей выкарыстання.

***Сноб***

## *сакрэт фірмы*

◆З 21 па 31 жніўня народны фальклорны ансамбль Белдзяржуніверсітэта "Неруш" прадстаўляў Беларусь на V Міжнародным фестывалі ў Егіпце. У фестывалі прымаў ўдзел 31 калектыў з краін чатырох кантынентаў.
Калектыў належна прадставіў Беларусь і універсітэт і атрымаў запрашэнне на наступны фестываль, які адбудзецца таксама ў Егіпце ў 1996 годзе.

◆Падрыхтоўчае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта рыхтуе інвалідаў да паступлення амаль ва ўсе вышэйшыя, сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы Рэспублікі Беларусь. На аддзяленне прымаюцца інваліды, якія маюць сярэднюю адукацыю, паспяхова прайшлі субяседаванне, могуць наведваць заняткі і якім у адпаведнасці з заключэннем медыкарэабілітацыйных экспертных камісій не супрацьпаказаны навучанне і праца па абранай спецыяльнасці.

◆У апошнія гады ў рэспубліцы адкрыта падрыхтоўка спецыялістаў больш чым па 20 новых спецыяльнасцях.

Для тых, хто цікавіцца гісторыяй і культурай, адкрыта спецыяльнасць "Культуралогія" ў Беларускім дзяржаўным універсітэце і Беларускім універсітэце культуры. Апрач таго, ва універсітэце культуры ўведзены новыя спецыяльнасці — "Народная творчасць" і "Мастацтва эстрады". У Беларускім дзяржаўным універсітэце — спецыяльнасць "Айчынная і сусветная культура".

Тым, хто любіць прыроду і хоча яе захоўваць, будзе цікава вучыцца па спецыяльнасцях "Экалогія", якія адкрыты ў Беларускім і Гродзенскім дзяржаўных універсітэтах, "Садоваааркавае будаўніцтва" — у Беларускім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце, "Абсталёўванне сельскіх тэрыторый" — у Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У Беларускім дзяржаўным эканамічным універсітэце адкрыта спецыяльнасць "Дзяржаўнае і муніцыпальнае кіраванне", у Віцебскім тэхналагічным універсітэце і Брэсцкім політэхнічным інстытуце — спецыяльнасць "Маркетынг". Беларуская дзяржаўная політэхнічная акадэмія ў гэтым годзе пачне падрыхтоўку спецыялістаў па спецыяльнасцях "Тэхналогія і абсталяванне ювелірнай вытворчасці", "Тэхнічная эксплуатацыя лятальных апаратаў і рухавікоў", Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі — па спецыяльнасцях: "Медыцынская электроніка", "Штучны інтэлект", Міжнародны інстытут па радыёэкалогіі імя А.Д.Сахарава — па спецыяльнасці "Радыёбіялогія і радыяцыйная медыцына", Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія — па спецыяльнасці " Сельскагаспадарчае індустрыяльнае рыбаводства".

Усяго ў 1995 годзе прыём у вышэйшыя навучальныя ўстановы Беларусі ажыццяўляўся па 180 спецыяльнасцях і 825 спецыялізацыях. Такім чынам, кожны жадаючы мае магчымасць атрымаць вышэйшую адукацыю з улікам сваіх схільнасцяў і здольнасцяў, выбраць будучую прафесію на свой густ.

## Вялікаму караблю — вялікае плаванне

Студэнты, якія сёння пераступілі парог універсітэта, скончаць сваё навучанне ў 2000 годзе. Доўгія пяць гадоў — што яны прынясуць за сабой? А пакуль мы вырашылі звярнуцца да студэнтаў першага курса факультэта журналістыкі, каб даведацца, з якім настроем прыступілі да вучобы тыя, каму належыць пачаць працу ўжо ў XXI стагоддзі. Дарэчы, амаль традыцыяй нашай газеты стала звяртацца да будучых журналістаў, каб даведацца пра іх думкі наконт таго ці іншага пытання. Бо менавіта яны ў хуткім часе будуць іграць не апошнюю ролю ў фарміраванні вашых, паважаныя чытачы, поглядаў.

Мы спадзяваліся, што моладзь факультэта глядзіць у будучыню з аптымізмам. І не памыліліся, бо першакурснікі поўныя не толькі аптымізму, але і вялікай рашучасці маладымі сіламі перавярнуць усю беларускую журналістыку.

— Мы зменім усё: наша тэлебачанне. Зробім яго такім, каб можна было глядзець.

— І не проста глядзець, а з вялікай цікавасцю. Трэба зрабіць больш добрых забаўляльных перадач. Каб цікава было маладым і сталым.

— Для нас на факультэце пакуль ўсё новае. Знаёмімся з усім, звыкаемся... Чым будзем займацца, пакуль не ведаем. Цікава ўсё...

— Які ў нас настрой? Мы можам усё! Хочаце, з вакна выскачым?

— А я мару пра свой тэатральны часопіс, магчыма тэле- або радыёперадачу. Хачу знаёміць з навінамі беларускага і сусветнага тэатральнага жыцця. Я сама вельмі люблю тэатр і хачу спалучаць дзве свае прыхільнасці: тэатр і журналістыку.

— Зараз шмат хто робіць стаўку на грошы і лічыць, што адукацыя — рэч непатрэбная для нашага часу. Гэта нават хвароба нашага грамадства. Мы не лічым так, і доказ таму тое, што мы паступілі на журфак. Будучыня — за людзьмі інтэлектуальнымі

— Тут памянулі пра адну хваробу грамадства... А колькі гэтых хвароб... Мне здаецца, што журналіст павінен стаць доктарам. Яшчэ здаецца, што нам гэта зрабіць будзе лягчэй — мы выраслі ў іншай эпосе...

— Ёсць ужо канкрэтныя творчыя планы. Хачу зняць сюжэт пра парашутыстаў. Пра іх пачуцці падчас палёту... Ужо дамовіўся, каб самому скокнуць з імі...

Спадзяюся, мы і вас упэўнілі: настрой у першакурснікаў аптымістычны. Толькі хто ж з паступіўшых не бывае аптымістам? Жадаем будучым калегам ажыццяўлення іх задумаў. Як кажуць: вялікаму караблю — вялікае плаванне.

***Кацярына Ткачэнка***




*Дзень беларускага пісьменства і друку сучасная прэса рэспублікі палічыла за сваё свята і адзначыць яго вырашыла адпаведна. З раніцы ў парку Горкага дзяржаўныя або паўдзяржаўныя выданні занялі хто прысады, хто нейкі куток, дзе і весяліліся кожны на свой лад. Праўда, можа надвор'е не ўдалося, а можа грошай было мала, але ўсё было сумнавата. З латкоў прадавалі розныя "калачы", ды цёткі ў этнаграфічных уборах спявалі песні. Адзіным цікавым момантам была надзвычайная колькасць журналістаў "на душу насельніцтва", ды яшчэ парадавала тое, што сустрэцца з былымі выхаванцамі прыйшлі шмат якія выкладчыкі факультэта журналістыкі на чале з дэканам.*





*школа першакурсніка*

# Скажу "бывай" я роднай хаце і буду жыць у інтэрнаце

Іншагароднім студэнтам абавязкова прыйдзецца спасцігаць навуку інтэрнатаўскага жыцця. Цяжэй за ўсё гэта рабіць тым, хто дома нават падлогу падмятаў па настойлівых просьбах маці. У інтэрнаце ж студэнт застаецца адзін на адзін з глабальнымі жыццёвымі праблемамі і вырашаць іх давядзецца самастойна.

Галоўнае, прызвычайся да думкі, што інтэрнат стане тваім другім домам. А каб быць паўнапраўным жыхаром, трэба ведаць і выконваць яго законы і традыцыі. Частку з іх ты прачытаеш на шыльдачках у калідорах, кухнях, ліфцёрках, аб другой — лепей распытаць у старшакурснікаў за шклянкай чая ( вядома, што чаяпіцце — самая папулярная форма інтэрнатаўскіх зносін). Абавязкова пасябруй з аднапакаёўцамі і не сварыся па дробязях — хутчэй за ўсё табе прыйдзецца жыць у гэтым пакоі на працягу года. Не забывайся і на суседзяў па паверху : калі-небудзь табе абавязкова спатрэбіцца соль, прас і г.д., а ў студэнтаў добрая ўзаемавыручка. Аднак пазбягай сітуацый тыпу:

Студэнт суседу па пакоі:

— Чаму ты надзеў мой плашч?

— Каб ён захаваў ад дажджу твой новы касцюм.

Трэба помніць, што ў інтэрнатах акрамя студэнцкай братвы можна сустрэць "левых", што прыходзяць бавіць вольны час у коле студэнтаў. Перш за ўсё ты падумай, што будзеш адказваць заўтра на занятках і замест усяночнай балбатні з сумніяцельнымі знаёмымі перапістай канспект лекцый .

Што датычыцца ўвогуле культурнай праграмы, то гэта напалову легальныя дыскатэкі. Лепш за ўсё месць добрых сяброў і па магчымасці тэлевізар. Дарэчы, тэлевізар можна ўзяць разам з аднапакаёўцамі ў пункце пракату.

Трэба падрыхтавацца і да сюрпрызаў у выглядзе прусакоў. Тым, хто сустракаецца з гэтымі жывёлінамі ўпершыню, паведамляю, што яны зусім бяспечныя. Нават уносяць нейкі жывы струмень у інтэр'ер вашага пакоя. Вось толькі без абеду могуць пакінуць ( праўда, не самых галодных) ды пашкодзіць бытавую апаратуру ( заўважна, што прусакі праяўляюць цікавасць да тэхнікі). Так, калі твой магнітафон адмовіцца работаць наадрэз, паспрабуй выцягнуць з яго пару-тройку вусатых "майстроў". Прыехаўшы дадому, перапрасі сумкі, бо прусакі любяць яшчэ і падарожнічаць.

Падрыхтуйся і да такіх бытавых праблем як сапсаваныя разеткі, выбітае шкло, паламаныя замкі. Вырашыць іх табе дапамогуць электрыкі, сантэхнікі, сталяры. Дзе іх адшукаць, спытай у старшакурснікаў або адміністрацыі інтэрната. Памятай, што, напрыклад, не закрыты ў ваннай кран прыносіць непрыемнасці не толькі табе, але і тым, хто жыве на паверх ніжэй. Калі ў цябе здарылася падобная непрыемнасць, трэба ліквідаваць прычыну затаплення і прыбраць ваду з падлогі. калі затапілі цябе — лепш за ўсё падняцца на паверх вышэй , сказаць, што не ўмееш плаваць і прапанаваць дапамогу.

Калі пачнецца пара сесіі, не забывай, што не ўсе здаюць экзамен у адзін дзень з табой і пастарайся не шумець з нагоды добра здадзенага экзамена — у некага гэта яшчэ наперадзе.

Зразумей, што пачынаецца новы перыяд у тваім жыцці і яго ты назавеш самым шчаслівым. Ты студэнт, а ў наш час гэта яшчэ нешта значыць. Вечары пад гітару і бяссонныя ночы перад экзаменамі падорыць табе другі дом і на час тваёй вучобы стане для цябе першым.

**Алёна Шаўкун**

## Каша "без сякеры"

Ні для каго не сакрэт, што для многіх іншагародніх студэнтаў-першакурснікаў першыя месяцы жыцця ў інтэрнаце маюць свае цяжкасці. І не дзіўна: дома ты быў на ўсім гатовым (мама прыбярэ, памые і пакорміць так смачна, што проста "пальчыкі абліжаш") — ніякіх клопатаў. А зараз ты ўсё павінен рабіць толькі сам. Дзячатам у гэтым плане прасцей: прыборка, мойка і кухня для іх не праблема.

А хлопцам іншы раз даводзіцца ой як цяжка. Бо запасы з дому ўжо на нулі. Добра, калі паспелі пазнаёміцца ў інтэрнаце з дзяўчынкамі, якія не-не дый пачастуюць смачным абедам. А калі пакуль не? На хлебе і малацэ доўга не працягнеш...

Для тых, хто сутыкнуўся з такімі праблемамі і зусім не ўмее гатаваць, мы прапануем рэцэпт надзвычай простай у прыгатаванні і неверагодна смачнай рысавай кашы. Гэтымі кулінарнымі сакрэтамі з намі падзяліліся хлопцы-першакурснікі з хімфака, якія толькі-толькі засяліліся ў інтэрнат.

Такім чынам, РЫСАВАЯ КАША ад старасты 5 групы І курса хімічнага факультэта Андрэя Антончыка:

Бярэце пяцілітровую каструлю, наліваеце ў яе 2 літры вады, ставіце на агонь і чакаеце, калі закіпіць. У кіпячую ваду насыпаеце 1 кг рыса. Прычым, лепш выкарыстоўваць драбнейшы рыс. Соль і масла не патрабуюцца.

У гарачай вадзе рыс пачынае разбухаць, і ваша каша падымаецца па самыя берагі. Не хвалюйцеся, усё так і павінна быць. Але адзначым, вада пастаянна выкіпае, таму не забывайцеся яе падліваць, інакш ваша каша падгарыць і будзе нясмачнай.

Калі каша "вырасла" настолькі, што вось-вось пабяжыць цераз край, наступае самы важны момант ( тонкі кулінарны сакрэт Андрэя) — частку кашы вы павінны перакласці ў іншую каструлю, паменшую. А пяцілітровую каструлю з напалову прыгатаванай кашай вы павінны зняць з агню ( такая каша можа захоўвацца цэлыя суткі).

У меншую каструлю вы даліваеце нямнога вады і варыце да гатоўнасці.

Калі каша гатова і вы адчуваеце, як прыемны арамат запоўніў усю кухню — гатуйце талеркі і лыжкі. На ваш густ можна дабавіць цукар і масла ( калі ёсць). Але яшчэ смачнейшая стане каша, калі дабавіць туды разынак. У вас няма пад рукой разынак? — Не бяда. У магазіне, што каля інтэрната, прадаецца яблычна-вінаградны кампот. Адтуль можна выбраць разынкі. Можна дабавіць у кашу і яблыкі з таго ж кампота.

Паспрабуйце, прыемнага вам апетыту! Неверагодна смачна! Акрамя таго, гэтай кашы хопіць на цэлыя суткі на 6-7 чалавек.

**Запісала Вольга Хадарэнка**

***Як вы бачыце, шаноўныя чытачы, гэты нумар "Беларускага універсітэта" адрозніваецца ад ранейшых. Рэдакцыя нашай газеты выйграла маладзёжны конкурс Фонду Сораса, прадставіўшы свой праект "Трансфармацыя газеты "Беларускі універсітэт" у сучаснае студэнцкае выданне". Калектыў рэдакцыі прыносіць падзяку Фонду Сораса за матэрыяльную дапамогу.***

*пленэры*

## Наш дом — Сусвет

7 верасня ў Рэспубліканскай мастацкай галерэі адбылося закрыццё І-га Дзіцячага міжнароднага пленэра імя М.Шагала і выстава прац дзяцей-удзельнікаў пленэра на тэму "Наш дом — Сусвет".

Ведаеце, што значыць дзіцячы пленэр? Гэта значыць, што сустракаюцца дзеці з розных дзяржаў, прывозяць свае малюнкі, знаёмяцца з творчасцю адзін аднаго, разам вандруюць і шмат- шмат малююць гуашшу, акварэллю, алоўкамі. Тэмы іх малюнкаў розныя: напрыклад, шматкаляровы ўкраінскі рынак; або вуліца Рыгі, намаляваная з любоўю да свайго роднага горада; або цудоўныя краявіды Беларусі, якія бачылі і перанеслі на паперу дзеці падчас вандровак; і зусім фантастычныя спалучэнні колераў, што нават не апішаш словамі. І мне здалося "не дзіцячымі" іх называюць не таму, што маленькі чалавек пачынае глядзець на свет больш сур'ёзнымі вачыма, а таму, што ёсць у іх трапяткое духоўнае пачынанне, якое з вялікай асцярогай і шчырасцю перадаюць фарбы.

Заканчэнне пленэра і адкрыццё выставы стала сапраўдным святам не толькі для дзяцей і іх бацькоў, а для ўсіх тых, хто трапіў у мастацкую галерэю. Арганізатар пленэру мастак і паэтэса Ірына Іванаўна Кузняцова пажадала ўсім удзельнікам пленэра зберагчы на ўсё жыццё дадзены ім дар любові, а таксама заўжды шанаваць сваіх настаўнікаў. Маленькіх творцаў пасвяцілі ў "сапраўдныя" мастакі і кожны з іх пакінуў пленэру свой аўтограф — пэндзлікам і фарбамі на вялікім ватмане ўсе 25 удзельнікаў пленэру ўвасобілі свой настрой. Потым былі падарункі і смачныя пачастункі.

Гэта свята, безумоўна, дзеці запомняць на доўгі час. Запомняць і будуць аднаўляць у сваіх малюнках месцы, якія падчас вандроўкі спадабаліся больш за ўсё: Віцебск, Полацк, Навагрудак, Ліпецкія азёры, Мірскі замак. А ў Ірыны Іванаўны ўжо планы правядзення пленэра, прысвечанага Экзюперы.

**Кацярына Ткачэнка**

*студэнцкае жыццё*

*Курс першы. Дзень першы.*

Самымі шчаслівымі 1 верасня ва універсітэце, безумоўна, былі першакурснікі. Сапраўды, прайсці цяжкі шлях ад абітурыента-95 да студэнта БДУ пашчасціла не ўсім, а толькі лепшым. Ззаду засталіся ўступныя экзамены, і абітурыенты ўжо — паўнапраўныя студэнты галоўнай у рэспубліцы ВНУ.

Яўген Маслюкоў — першакурснік геафака.

— Жэня, геафак БДУ — своечасова прынятае рашэнне ці выбар метадам тыку?

— Гэта не было імгненнае рашэнне напярэдадні падачы заявы. Год я займаўся на курсах факультэта даўніверсітэцкай падрыхтоўкі па абранай спецыяльнасці.

— Тваё ўражанне ад уступных экзаменаў?

— Прыкладна такое, як я сабе і ўяўляў — крыху хваляванне і ўпэўненасць у сваіх сілах. Увогуле ж падалося, што экзаменатары пыталіся болей, чым выкладалася ў школе, але потым зразумеў: на ўроках трэба быць крыху ўважлівей...

— А спісаць спрабаваў?

— Іншыя спрабавалі. За гэта некаторых з аўдыторыі выгналі.

— Сёння ты прыйшоў у першы раз на першы курс. Паспеў з кім пазнаёміцца?

— Многіх я ведаю з падрыхтоўчых курсаў, а вось сёння яшчэ ні з кім не пазнаёміўся. Гэта ж толькі першы дзень...

*Курс першы. Дзень другі.*

На гэты раз мы сустрэліся са студэнтамі-першакурснікамі, якія засяліліся ў інтэрнат. І вось што яны нам расказалі аб сваіх першых уражаннях ад інтэрната і універсітэта, а таксама аб планах на будучыню.

Андрэй Камандзенка — студэнт 1-га курса фізфака.

— Ва універсітэце добра. Мы з задавальненнем адвучыліся першы дзень. Складанасцей пакуль няма. Усё цудоўна!

— А сесіі не баіцёся?

— Першая сесія, канешне, страшыць. Але, напэўна, таму і страшыць, што першая. Пакуль жа мы — навічкі і не ведаем, як складуцца нашыя адносіны з выкладчыкамі, не ведаем сістэмы навучання ў ВНУ і многіх-многіх тонкасцяў.

— Скажыце, кім вы бачыце сябе ў далейшым, пасля заканчэння універсітэта?

— Жыццё — штука цяжкая і непрадказальная, і як складзецца ў далейшым — не вядома, але ў мяне ёсць маленькая мара — пайсці ў навуку. Вельмі хацелася б спадзявацца, што яна здзейсніцца.

Вольга Юдо — студэнтка 1-га курса хімфака.

— Я паступіла ва універсітэт, дзякуючы маёй школьнай настаўніцы, якая прывіла мне любоў да хіміі. І цяпер я таксама хачу быць настаўніцай, пайсці працаваць у школу і вучыць дзяцей.

— А ў інтэрнат не страшна было ісці?

— Канешне, крышачку было страшнавата. Ведаеце, калі мяняеш месца жыхарства, заўжды бывае неяк нязвыкла. Дый зараз, хаця мы ўжо трохі абжыліся і прызвычаіліся, усё адно, як быццам, бы было весела і ўтульна, часам вельмі хочацца дадому.

— Калі мы зайшлі ў пакой, наша першае пытанне было: " Куды мы трапілі?"— шумяць хлопцы-хімікі. — Паўсюль бегалі прусакі. Канешне, мы чакалі іх пабачыць: начуліся аб гэтых няпрошаных кватарантах; але не ў такой жа колькасці!..

— Але зараз у вас вельмі ўтульна...

— Так, мы ўжо добраўпарадкаваліся. Жывем адной вялікай сям'ёй. І хаця пакуль у нас няма ні магнітафона, ні тэлевізара, ні радыё — нам весела!

— А вучобы пасля першых дзён не спалохаліся?

— Канешне, вучыцца будзе складана — гэта мы зразумелі ў першы ж дзень. Сістэма навучання ў ВНУ вельмі адрозніваецца ад школьнай — пакуль прызвычаішся!..Таму галоўнае для нас зараз — пратрымацца ва універсітэце як мага даўжэй, каб не "выкінулі" зачасна.

Сяргей Пульша — студэнт 1-га курса журфака.

— Я думаю, што складана паступіць, а вучыцца будзе цікава, а таму — лёгка. Я абавязкова хачу авалодаць машынапісам, стэнаграфіяй, вывучыць мовы: англійскую і нямецкую — у першую чаргу. А калі ўдасца, дык і эсперанта. Аднак у большай ступені я разлічваю на свае сілы, чым на "добрага дзядзечку-выкладчыка", які прыйдзе і навучыць.

*Курс першы. Дзень трэці...*



*На пачатку верасня мінчане заўважылі нешта незвычайнае ля будынку французскага пасольства на плошчы Свабоды. Аўтобусы прыпынак быў увесь завешаны жоўтымі і блакітнымі сцягамі з выявамі зямнога шара і сімваламі ядзернай небяспекі. А побач " тусаваліся" некалькі маладых людзей не нашага выгляду.*

*" Мы ідзем, каб пабачыць людзей, і каб людзі заўважылі нас. Мы жадаем, каб людзі верылі нам і мы хочам верыць людзям. Таму мы ідзем." Гэта было напісана на лістоўках, якія яны раздавалі прахожым. Да таго ж яны збіралі подпісы супраць французскіх ядзерных выпрабаванняў, давалі жадаючым візы ў сваю міфічную "Nuclear Free State" — Бяз'ядзерную Дзяржаву. Дзіўна, што іх не чапала міліцыя.*

*" Мы ідзем па 25 кіламетраў у дзень. Мы ідзем 6 дзён і тыдзень. Мы вегетарыянцы. Мы арганізоўваем усё на свае грошы і задавальняемся малым. Здаецца, мы ідзем добра.*

*Але нам не хапае Вас! Пойдзем з намі!"*

*Юнакі і дзяўчаты з розных краін Еўропы, прадстаўнікі арганізацыі "For Mother Earth" — дзеля Маці-Зямлі выйшлі з Брусэля 12 студзеня і пешшу пайшлі 5500 км да Масквы, куды яны плануюць прыйсці 12 кастрычніка, у Міжнародны Дзень Салідарнасці з карэннымі народамі ўсіх кантынентаў планеты.*

*" Энергія Сонца — аснова ўсяго жыцця на планеце на працягу мільярдаў гадоў. Без усякага забруджвання наваколля. Яго энергіі і дагэтуль хапае на патрэбы ўсіх жывёл і раслін. Хапіла б і на нашы патрэбы, калі б мы згадзіліся жыць у гармоніі з прыродай".*

*Паход праз Еўропу за бяз'ядзерны свет суправаджаецца перасоўнай выставай альтэрнатыўнай энергіі. Удзельнікі паходу выступаюць за нераспаўсюджванне ядзернай зброі і за поўнае раззбраенне існуючых ядзерных краін. Але дзеля гэтага неабходна яднанне.*

*" Мы жадаем сустрэцца з Вамі і пазнаёміцца з Вамі, паразмаўляць і прайсці разам, каб лепей ведаць адзін аднаго. Мы хочам наблізіць пару сапраўднага міру на планеце.*

*І можна пачаць сёння".*

*Больш поўную інфармацыю Вы можаце атрымаць, патэлефанаваўшы ў РБМО "Некст Стоп-Нью Лайф" па тэл. (0172) 21-81-79.*

**Наш карэспандэнт**

*анекдоты ад студэнтаў*

На экзамене па крымінальнаму праву прафесар пытаецца:

— Можаце вы мне сказаць, што такое падман?

— Гэта адбудзецца, прафесар, калі вы мяне правалiце.

— Растлумачце чаму.

— Паводле крымінальнага кодэкса падман здзяйсняе той, хто, карыстаючыся няведаннем другой асобы, наносіць гэтай другой асобе ўрон.

◆

У адной вышэйшай навучальнай установе ў вестыбюлі стаяла вешалка для прафесараў і дацэнтаў, каб яны маглі без чаргі ў гардэробе прайсці ў аўдыторыю. Яе ўпрыгожвала шыльдачка: "Толькі для выкладчыкаў". Нехта са студэнтаў унізе дапісаў: " Але можна вешаць і паліто".

◆

Тэлеграма: "Як прайшоў экзамен? Тэрмінова паведамі".

Адказ: " Экзамен прайшоў бліскуча. Прафесары ў захапленні. Просяць паўтарыць увосень".

◆

Мужчына сярэдніх гадоў ставіць тры крыжыкі замест подпісу на дакументе. Чыноўнік пытае яго:

— Чаму тры крыжыкі?

— Апошнія два азначаюць маё імя і прозвішча, а першы — навуковую ступень.

## ДАІ паведамляе

Пачаўся навучальны год. У Белдзяржуніверсітэт прыйшло папаўненне — студэнты першага курса, якія прыехалі з розных раёнаў Беларусі. Аднак многія з іх не надавалі значэння вывучэнню правілаў дарожнага руху.

Становішча на дарогах горада па-ранейшаму застаецца складаным. За сем месяцаў бягучага года паранена 398, загінулі 72 чалавекі. Па Маскоўскаму раёну Мінска здзейснена 53 дарожна-транспартных здарэнні, у якіх паранена 59, загінула 6 чалавек. Каб палепшыць становішча, згодна з загадам міністра Унутраных спраў Рэспублікі Беларусь " Аб парадку назначэння і правядзення экспертызы ведання вадзіцелямі правілаў дарожнага руху" разам з прымяненнем мер адміністрацыйнага ўздзеяння вырашана накіроўваць вадзіцеляў на экспертную праверку пры здзяйсненні імі наступных парушэнняў:

— перавышэнне устаноўленай скорасці руху на 20 км гадз. і больш;

— праезд на забараняючы сігнал светлафора;

— невыкананне патрабаванняў аб прадастаўленні пераважнасці ў руху;

—стварэнне аварыйнай сітуацыі;

— здзяйсненне на працягу года трох і больш парушэнняў ПДР.

Мы звяртаемся да вадзіцеляў з просьбай выконваць Правілы дарожнага руху.

**А.Кудраўцаў, дзяржаўтаінспектар ДАІ Маскоўскага раёна**

# Мастацкая Гасцёўня



Кадр з фільма "Што ў Сенькі было"

## *Юлія Касмачова: "У мяне было самае цудоўнае дзяцінства на зямным шарыку"*

Ва ўсіх сваіх фільмах Юлія Касмачова грала дзяцей, якія ўмеюць плакаць ад чужога болю. Якія ўмеюць адчуваць. У Юлі было дзяцінства кіназоркі. У свет андэграўнда яна ўвайшла Маленькім Прынцам кінематографу. "Дарослая" папулярнасць Юлі — лаўры абаяльнай вядучай дзённіка "Славянскага Кірмаша".

Кажуць, што з цудоўных дзяцей вырастаюць кепскія дарослыя. У Юлі гэта не так, можа, таму што ёй пакуль 19. Мы сядзім ва ўтульным яе сонечным пакоі, абклееным плакатамі з малпамі і заваленым імі ж ( Юліна захапленне), і я лаўлю сябе на думцы, якая яна на дзіва шчырая і адначасова розная. "Хатняе дзіця" , якое плача над успамінамі дзяцінства, — гэта яна. Дзяўчынка, якая абажае дыскатэку "Кастрычнік", сябрамі якой з'яўляюцца Раінчык і музыканты "Нью-Джэк-Сіці", — гэта таксама яна. Нервовая, з прагай кахання сучасная прынцэса, якая піша ў 4 гадзіны раніцы вершы пад дзвярыма ўласнай кватэры, — ізноў-такі яна. І само сабой узгадваецца вызначэнне — "правільная жанчына ў няправільным свеце".

Дзіцячую кар'еру ў кіно перапыніла мама, рашуча дамогшыся таго, каб дачка спакойна давучылася ў школе. "Зарубіўшы" здымкі ў фільме, дзе прапанавалі ролю Прынцэсы. Несыграную Юлькай ролю, якой яна падсвядома кіруецца ў жыцці.

Шасцігадовая Юля танцавала ў дзіцячым ансамблі "Равеснік", калі там з'явіліся людзі з кінастудыі, якія набіралі дзяцей для спроб у фільме "Абуза". Свежай дзіцячай памяццю Юля "схапіла" сцэнарый, і калі рэжысёр надумаў па ходу дзеяння нешта змяніць, дзіця наладзіла яму скандал. Рэжысёр спалохаўся, група прыйшла ў захапленне — і дзяўчынку на ролю зацвердзілі. У хуткім часе І.Дабралюбаў запрасіў яе ў "Белыя Росы", а потым Юля трапіла на Адэскую кінастудыю. Калі Радамір Васілеўскі зняў палову карціны "Што ў Сенькі было", Юлю перахапілі яшчэ і на ролю Чырвонай Шапачкі ў "Казках старога чараўніка". Яшчэ была Лізавета ў "Трэцім у пятым шэразе", "Навучыся танцаваць", "Тапінамбур", маса агучаных мультфільмаў і ўсемагчымых польскіх, грузінскіх фільмаў, дзве ролі ў спектаклях ТЮГа.

Паступіць на факультэт журналістыкі таксама перапанала мама, патлумачыўшы, што гэтая адукацыя дазволіць быць і тэлевядучай, і літаратарам, і актрысай, калі здарыцца цуд і Юльцы прапануюць ролю. Дарэчы, калі яе пытаюць, якую ролю ёй хацелася б сыграць зараз, яна кажа пра сваю мару — зняць фільм пра сябе і граць у ім. Яна дакладна ведае, што гадоў да сарака напіша кнігу пра свае дзіўныя ўзлёты і падзенні, пра сябе як жанчыну, сябра, чалавека, прайшоўшы нанова свой шлях ад крохі да статнай дамы. Таму часам яна ўключае дыктафон і нагаворвае матэрыял будучай кнігі.

Юлькіна настальгія — Адэса. Горад, які яна пяшчотна любіць і дзе любяць яе, дзе жыве любімы яе рэжысёр, дзе на кінастудыі дагэтуль вісіць аграмадны партрэт Марускі з фільма "Што ў Сенькі было".

*"І рэжым у Адэсе ж быў — поўны атас. Раніцой бяжыш у школу ( якраз пайшла ў першы клас), потым — на кінастудыю, і да 11-12 начы здымаем "Сеньку". Дарэчы, у Мінску пайшла ў школу з музычным ухілам, а значыць, займацца давялося і тут. Усе ідуць абедаць — Юлі выносяць у калідор піяніна, і Юля грае. А мама ўмудраецца пхаць мне бутэрброды. І да чатырох раніцы — здымкі "Казак". У восем — ізноў у школу. Цяжкавата было. Дарослыя ўсё здзіўляліся — адкуль столькі энергіі : не стамляецца, паспявае і на мора бегаць, і дзіцячымі сваймі справамі займацца. Грала з цудоўнымі людзьмі — Васільевай, Еўсцігнеевым, Антонам Табаковым, яго бацькам...*

*Тое, як мяне прымалі ў акцябраты, — запомнілася на ўсё жыццё, гэта было фенаменальна. Мы ў той дзень здымаліся. Антоша Табакоў быў вольны і рыхтаваў святочную вячэру. Для дарослых, натуральна, гэта было нагодай выпіць: а як жа, любімую Чырвоную Шапачку прынялі ў акцябраты! У вялізны бутафорскі бакал кінулі маю зорачку, налілі чырвонага віна, і кожны па чарзе піў і казаў мне розныя пажаданні. Пачалося гэтае свята ў дзве гадзіны начы..."*

Мама побач з Юляй была заўсёды; зрэшты, бацькі, людзі мастацтва, аказаліся таленавітымі яшчэ і як бацькі. Маці дапамагала выстаяць у дні цкавання аднакласнікамі, якія здзекваліся з "актрысы пагарэлага тэатра". У школе была маса праблем ад пастаянных здымак, настаўнікі не асабліва любілі, хіба што дырэктара В.А.Зямскову Юля дагэтуль называе дарагім і любімым чалавекам. Праўда, гадоў да пятнаццаці дзяўчына навучылася абараняцца, знайшоўшы адказы на ўсе пытанні сваіх нядобразычліўцаў у засвоеным маміным выказванні:"Знайдзі доўгую вышку, забярыся на яе і плюй на ўсіх, хто робіць табе балюча". І хаця часта прыходзіла са школы ў слязах, зараз яна гаворыць, што "аддала б усё сваё жыццё за тое, каб зноў павучыцца ў школе, адчуць сябе вучаніцай у доўгім белым фартуху і вярнуць час здымак у Адэсе. Не пазней як учора я нястрымна рыдала, развешваючы на сцэнцы дзіцячыя свае фатаграфіі — хачу зрабіць Сцяну Часу. Хоць было ўсё: і самая высокая дзяўчынка ў класе называла мяне "дурачкай", а я яе "швабрай", — але ў мяне было самае чароўнае, самае цудоўнае дзяцінства на зямным шарыку".

**— Але цяпер-то ты змагла стаць "як усе"?**

*— У дзяцінстве было вельмі прыемна, калі людзі ад 17 да 60 гадоў падыходзілі па аўтографы, паказвалі мяне сваім дзецям: "Глядзі, вось гэтая дзяўчынка — актрыса". А ва універсітэце я хачу, каб мяне ўспрымалі проста як чалавека, не як былую "артыстку", не як дачку добрай мамы і таты-музыканта. Вельмі доўга я пазбягала ўспамінаў, не хацела гаварыць пра сваё мінулае; цяпер я ўжо магу гэта рабіць... Ва універсітэце ставяцца да мяне добра, ёсць сябрытаварышы, цікава туды проста прыйсці, пасядзець на занятках, патрапаць языкамі. Студэнтка з мяне не надта, бо чалавек я да вучобы не прыстасаваны.*

У пакой забягае мама, "страляе" ў Юлі цыгарэту. Зносіны нагадваюць размову сяброўках, і я пытаю Юльку аб праблеме "бацькоў і дзяцей".

*— Па-сапраўднаму дарослай я пакуль не стала — так, каб ад "А" да "Я". Бо дарослы чалавек з усім упраўляецца сам, а мяне, скажам, корміць і апранае мама. Яе вельмі паважаю як чалавека, як жанчыну. Другой такой мамы не адшукаць на белым свеце. Адзінае — я не магу расказаць маме пра шмат што асабістае, не таму, што не зразумее, проста так склалася. Але мы часта гуляем удвох па вечарах, мы максімум часу праводзім разам, і яна стараецца спакойна ставіцца да ўсяго, што са мной адбываецца, прызнаючы, што чалавек павінен рабіць, думаць тое, што ён хоча. Яна апошняй даведалася, што я куру, хаця куру я вельмі даўно. Першай дазналася цёця: я прытопала са школы, а так як мне падалося, што дома нікога няма, адразу ў форме — курыць на балкон. І тут ззаду: "Юля, ты ўжо дома?" Мая худзенькая цёця спала, ухутаўшыся коўдрай, і я не заўважыла. Яна нічога нікому не расказала. А з мамай атрымалася інача́й. Мы прыбіралі кватэру, мне захацелася курыць, і я так настойліва пачала прасіцца вынесці смецце або пайсці па хлеб, што мама, ведаючы маю "непад'ёмнасць", раптам спакойна неяк вельмі сказала: хочаш курыць — ідзі на кухню. Па прынцыпу — лепей дома, чым за вуглом. І з таго часу я куру дома, хаця бачу — у душы яна перажывае праз гэта.*

Дарослай Юля адчула сябе гадоў з 18, хоць заўсёды была вельмі самастойным дзіцём, якога ў 3-4 гады ўжо адпраўлялі ў краму. Калі ўпершыню ехала ў школу адна: тралейбус паламаўся і далей не пайшоў, — вельмі спалохалася, але сказала сабе: гэта ж родны горад, навокал дарослыя людзі. З таго часу заўжды стараецца знайсці выйсце з любой сітуацыі. Топіць, падаўляе свае істэрыкі, прымушаючы сябе думаць, як быць далей. Хаця кажа, што цяпер надыйшоў момант, калі вельмі хочацца стаць маленькай. Смеючыся з сябе з сумам:"І не сказала б, што ў мяне па жыцці праблемы. Няма ў мяне праблем. Бываюць, але яны такія маленькія, нікчэмныя".

Рэзка змяніўшы тэму, яна закурвае: "Мары аднаго чалавека так часта разбіваюцца аб жаданні другога..."

Я ўжо ведаю, што яна марыла стаць актрысай, марыла пра ВГИК, і таму пытаю: пра што ж марыць цяпер?

*— Стаць нармальным чалавекам. Талковым, мыслячым, лагічна і цвяроза мяркуючым — каб усё з галавой у парадку было. Каб заўжды — мама і тата, каб заўжды — сям'я. Каб у мяне быў маленькі сынок — дзяўчынку чамусьці не хачу. Для яго я вылезу са скуры, зраблю ўсё, каб ён быў самы лепшы, каб у яго ўсё было самае лепшае. Я стакроць аддам яму тую любоў, што маці дае мне. І вырашаць я буду сама, адна, без чыёйнебудзь дапамогі, бо хачу перажыць гэты боль. Хаця ад мамы засвоіла, што хворай быць не модна, і калі мне фізічна кепска, у любой кампаніі гэта хаваю. Як жанчына, я хачу бачыць заўсёды ў мужыках не толькі жаданне, але і павагу да мяне. Не ведаю, дзе я апынуся ў гэтым жыцці, кім усё ж стану: вядучай, журналістам, актрысай, пісьменніцай, — але толькі каб атрымалася Стаць, а не пасярэдзіне, збоку прыпёку. Так, я павінна была стаць актрысай, гэтая прафесія мне блізкая як ніякая іншая, і нідзе я не адчуваю сябе так спакойна, як на сцэне, з гледачамі. Так, гэта маё, гэта цікава, класна, цудоўна, але з другога боку — як жыць, працаваць у тэатры і атрымліваць за гэта капейкі? Калі не было відзікаў, людзі абажалі кіно, хадзілі ў тэатр, білетаў было не дастаць. А зараз што адбываецца на кінастудыі? Калі раней адначасова здымаліся трыццаць фільмаў, то цяпер — адзін-два. І беларускія акторы ў іх не здымаюцца, таму што ў карцін ёсць спонсар, а ў спонсара — якаянебудзь дзяўчынка, жонка ці сяброўка, і вось гэтае юнае страшыдла ў галоўнай ролі і здымаюць. Хаця... Цудоўна, канешне, калі табе званяць раптам і запрашаюць агучваць карціну.*

Юля прывыкла глядзець да канца ўсе фільмы, нават самыя нудныя, паважаючы працу мастака. Не сыходзіць, не спаць, а проста глядзець. І з панядзелка ў панядзелак прыходзіць у кінатэатр "Масква" абавязкова на апошні сеанс. Вельмі любіць фільмы "Прыгажуня", "Прывіды" і "Дзевяць з паловай тыдняў". І, натуральна, "Знесеныя ветрам", як і кнігу, якую перачытвае ў шосты раз.

Перасаджваецца з фатэля на падлогу, хітра жмурыцца: "Так, што ж я яшчэ люблю?.." Любіць кніжку са школьнай праграмы "Вайна і мір" ( таксама пастаянна перачытвае) і вершы Эдуарда Асадава, любіць Баха, заўсёды Баха, пад якога засынала ў дзяцінстве, а з сучаснага — рамантычныя замежныя мелодыі. Вельмі любіць Ван Гога. Для Юлі ён пачаўся з выпадкова нечага пра яго прачытанага, потым яна стала апантана збіраць пра яго ўсё, што толькі магчыма: ад мастацкай літаратуры да манаграфій. Любімая яго карціна — "Сланечнікі". Любіць чорны колер і колер марской хвалі. Любіць зорнае неба. І ваду ( бо задыякальны водны знак). Любіць архідэі. Вельмі любіць жывёл, асабліва малпаў і сланоў — лічыцца, што слон з узнятым хобатам прыносіць шчасце, і сланоў гэтых Юля таксама збірае. Яна марыць, стаўшы багатай настолькі, што грошы можна будзе выдаткоўваць на рэчы абстрактныя, адкрыць заапарк, але не цесны, жахлівы, а велізарны, дзе ў жывёл будзе амаль свабода. Але гэта толькі пасля таго, як дапаможа найбольшай колькасці дзяцей, у якіх аказаліся бяздарныя бацькі. Любіць кока-колу, апельсінавы сок. Улюбёная страва — смажаная бульба: "Смажым яе з сяброўкай тры разы на дзень і вельмі шкада, калі справы нас ад гэтага адрываюць". Любіць ашаламляльна апранацца, выбіраючы дзве крайнасці — элегантныя вечаровыя туалеты і "а-ля хіпі" з кашуляй навыпуск. Любіць карціну, якая пастаянна ўзнікае: скалы, якія навісаюць над морам, начная лагуна, зорнае неба, маладзік ці поўня, побач — вельмі блізкі, каханы мужчына. Проста сядзець на беразе і балтаць, а потым плыць разам на лядашчым чаўне пад аддаленыя гукі губнога гармоніка.

Любіць танцаваць, асабліва бальныя танцы, нават умудрылася на падлеткавым конкурсе падзяліць з прафесіяналамі першае месца, упершыню пабачыўшы свайго партнёра за 15 хвілін да выступу. І дыскатэкі любіць і ходзіць на іх не дзеля зносін, а дзеля стыхіі танцу.

Не любіць смерці, сварак, звадак, войн. Не любіць фасолевы суп.

**— А каханне, Юля?**

*— Адносіны мужчыны і жанчыны для мяне, паўтаруся, перш за ўсё патрабуюць павагі. Не веру ў тое, што з мілым рай і ў будане, бо есці ж хочацца, і рана ці позна каханне аб штосьці разаб'ецца. Каханне для мяне — гэта вельмі ўзвышанае пачуццё, і не ведаю, ці магу лічыць, што ўжо яго адчула. Быў чалавек, з якім я сустракалася чатыры гады, які ва ўсім быў для мяне першым. Але прайшоў час, хай і не вялікі, яго няма побач, і я разумею, што гэта было проста нешта вельмі мілае, дзіцячае, натуральнае, пяшчотнае... Мне шалёна падабалася, што ў яго ёсць старэйшыя сябры — яго "аўтарытэты" у пэўных колах, гэта кідала водбліск на мяне, мне гэта льсціла. Але прыйшлі іншыя каштоўнасці, іншыя крытэрыі. У якасці спадарожніка свайго жыцця хацела б бачыць чалавека разумнага, які думае, не абавязкова каб ён быў з мільёнамі. Бо калі пара ўмее рабіць нешта рукамі і галавой, то, няхай не адразу, яны змогуць разам зарабіць сабе і дом, і грошы. Да гэтага я стаўлюся, зыходзячы з прымаўкі: калі ты разумны, пакажы свае грошы.*

*Вось з сябрамі ў мяне напружанне. Бо гэта людзі, якія ведаюць цябе ўсю, а такіх мала. Зато таварышаў шмат, і народ вельмі разнамасны: ад людзей, мякка кажучы, не вельмі ў агульнапрынятым сэнсе добрых да вядомых паэтаў, музыкантаў. Вадзіцца з імі мне лёгка, ізноў дзякуючы маме, якая дала мне ўласнае выхаванне ў галіне мастацтва, і няхай павярхоўна, але гаварыць я магу пра ўсё.*



Усё ж, уздыхаючы пра сцэну, пра здымкі Юля настройваецца на тое, што яе сферай застанецца тэлебачанне. На "Славянскім Кірмашы" яе прызналі і прынялі, хоць яна кажа, што для большых поспехаў не стае пакуль працалюбства. Чэсна ў гэтым прызнаецца і дадае:"Зрэшты, усё будзе добра".

А жаданне, якое зарадзілася яшчэ ў 7 класе, жаданне напісаць кнігу аб дзяўчыне, жанчыне з незвычайным лёсам толькі пацвярджае яшчэ, што пачатак жыцця і сапраўды ў Юлькі не такі, як ва ўсіх. І менавіта ёй больш за ўсіх астатніх хочацца верыць і змагацца за здзіўляльнасць і нянуднасць працягу свайго дзяцінства.

***Ціна Клыкоўская***


БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ЗАСНАВАЛЬНІК ГАЗЕТЫ — РЭКТАРАТ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ...

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
220079, г. Мінск, 1-ы Загарадны зав., 3.

14 верасня
Зак. 659.
Т. 1000 экз.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 411—412*
*ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

В. а. рэдактара
Т. М. КАЗАК